№ 12 (41) Нядзеля, 17-га красавіка 1927 г. м. Вільня Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыяна[...] Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмок[...]—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Ludwisarska 5 m. 2.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

ВАЖНЕЙШАЕ.


З усіх беларускіх куткоў даходзяць весткі аб паўставаньні ўсё новых і новых беларускіх пляцовак. Аднак-жа на гэты раз ужо не ідзе гутарка аб аткрыцьці сотняў і тысячаў — палітычных гурткоў нябошчыцы Грамады, якія як грыбы расьлі і як грыбнае парахно рассыпаліся. Прыходзяць весткі аб росьце беларускіх культурных пляцовак. У рожных паветах паўсюды паўстаюць гурткі „Прасьветы", каля іх гуртуецца моладзь, пачынае цікавіцца грамадзкім жыцьцем, растуць бібліятэкі, чытальні, аматарскія групы, групы музыкальныя, нават спартыўныя. Расьце сьвядомасьць, пазнаецца глыбей мова.— І не атручанае паветра ненавісьці, партыйнай злобы, клясовай барацьбы—нясецца ў нашую беларускую вёску, а ад гурткаў „Прасьветы" ліюцца праменьні нацыянальнага сонейка — беларускай культуры! Гэты зварот да культурнай працы, гэтае імкненьне да пашырэньня роднай асьветы, ёсьць зьявішча надзвычай важнае і радаснае. Яно паказвае, што беларускае нацыянальнае адраджэньне выходзіць на праўдзівую дарогу. Не дарогу рэвалюцыйна-грамадаўскіх экспэрымэнтаў, якія павінна былі нібыта хутка і адразу прывясьці да нацыянальнага вызваленьня, а на дарогу цяжкай павольнай і ўпорнай культурнай працы. Нарэшце на дарогу, на якой можна *спакойна* працаваць. Бо культурную працу можна рабіць толькі спакойна, ціха і паволі, а не пад гукі гарматаў і бомбаў.

І той факт, што у апошнія часы асабліва шпарка пачалі расьці гурткі „Прасьветы" паказвае, што народ ласьне і выбірае найспакайнейшую дарогу да сваей культурнай працы. „Прасьвета" ад самага моманту свайго паўстаньня была і ёсьць спакойнай, паступовай, зусім апалітычнай арганізацыяй. Ня было выпадкаў, каб гурткі „Прасьветы" ўжываліся бы, ці ўцягваліся ў якую колечы палітычную акцыю ці авантуру, што мела мейсца не раз з іншымі культурна-асьветнымі арганізацыямі, якія часта-густа ўцягваліся сваімі правадырамі да палітыкі і *шкодзілі* агульна беларускай працы.

І той факт, што „Прасьвета" ніколі не давала сябе ўцягваць у жадную палітыку дае гварантыю, што творчая праца яе будзе трывалай. Пры ўсім жаданьні прыляпіць які-небудзь ярлык да яе гурткоў ці інстытуцыяў ці то комуністычны, ці то антыдзяржаўны, гэтага ніяк і ніхто зрабіць ня здужае, бо за 2 гады істнаваньня „Прасьветы" ня было аніводнага выпадку, каб пляцоўкі „Прасьветы" былі бы замешаны да якой небудзь палітычнай працы.

Дык з вялікай прыемнасьцю спатыкаючы рост гурткоў „Прасьветы", як новы, здаровы абʼяў трываласьці і сілы беларускага нацыянальнага руху, мы ад усяго сэрца пажадаем „Прасьвеце" ў далейшым яшчэ шырэй і глыбей сягаць сваей працай у народныя гушчы Беларускага Народу. У гэтай найважнейшай, вечнай працы на ніве культуры і нацыянага адраджэньня, да якога пачынае імкнуцца нашая шэрая сялянская масса, а перад усім вясковая моладзь, мы павінны аказаць „Прасьвеце" ўселякую дапамогу, кінуць ўсе найбольш здольныя сілы, каб парыў народу да сьвятла не прапаў дарма, а даў бы вялікія і добрыя плады.

Манэўры амэрыканскага флету.



Браненосец „Арызона", які і праходзіць праз Панамскі канал у дарозе да Атлянтыцкага акіяну, гдзе будзе прымаць удзел у вялікіх манэўрах флёту Злучаных Штатаў.

Падзеі у Кітаі.

У апошні час сытуацыя ў Кітаі рэзка перамянілася на некарысьць бальшавікоў.

Гэтак на заняцьце жаўнерамі Чанг-Со-Ліна савецкага пасольства—бальшавікі адказалі рэзкай нотай, пагражаючы вайной. Аднак усім было ясным, што бальшавікі распачаць вайны ня могуць, бо яна прынясла-б ім няўхільны канец. Дык і агранічылася ўсё славамі.

Асабліва-ж важным здарэньнем зьяўляецца здрада бальшавікам камандуючага кантонскай арміяй гэн. Чан-Кай-Шэка, які акружыў савецкае консульства ў Шанхаі. Есьць весткі, што гэн. Чан-Кай-Шэк адмовіўся весьці далейшае наступленьне на Пэкін і маніцца абвесьціць сябе дыктатарам. Пачаў ён ужо распраўляцца з сваімі камуністамі Распусьціў некалькі чырвоных батальёнаў і арыштаваў шмат агітатараў. Пры разаружэньні работніцкіх батальёнаў больш пятнадцаці асоб было забіта.

Асабліва моцнае ўражаньне зрабіла на ўсіх паражэньне кантонскага войска белымі, прычым кантонскае войска была прымушана адступіць на іншы бераг ракі Ян-Тсэ-Кʼянгіі і панічна ўцякае ў кірунку на Шанхай.

Напружаньне паміж чырвоным урадам гэн. Чан-Кай-Шэкам расьце. Чан-Кай-Шэк пакінуў Шанхай і адправіўся да Нанкіну.

Магчымым зьяўляецца паразуменьне паміж Чан-Со-Лінам і Чан-Кай-Шэкам. А тады справа бальшавікоў у Кітаі будзе прайграна.

Сялянскае паўстаньне на Украіне.

Паводле вестак з Менску, у губэрнях Чарнігаўскай і Полтаўскай дайшло да вялікіх сялянскіх бунтаў. Адначасна да Масквы надыйшоў рапарт камандзіра вайсковага вокругу Уборэвіча, каторы паведамляе, што становішча чырвоная арміі на цэлым левым беразе Дняпра зьяўляецца надта ня пэўным. З мэтай ліквідацыі сялянскіх бунтаў могуць быць высланы толькі аддзелы для спэцыяльных даручэньняў і Г. П. У., але гэта сілы занадта слабыя.

Палітычны агляд.

Палітычныя падзеі на Д. Усходзе зьнянацку падлеглі рэзкай перамене. Гэтага і трэба было чакаць у сувязі з разьвіцьцём ваеннай акцыі кантонскай арміі проці Пэкіна. Дыктатар паўночнага Кітая маршал Чанг-Тсо-Лін, у руках якога знаходзіцца лёс 150 мільёнаў кітайцаў, ня мог спакойна чакаць пакуль кантонцы, падтрымліваныя бальшавікамі, зробяць з ім пасьля заняцьця Пэкіна і Мукдэна тое, што зрабілі з абаронцам Шанхая гэнэралам Чэў, які па трэбаваньню кантонскага губэрнатара Шанхая казьнены. Дзеля гэтага Чанг-Тсо-Лін пачаў сваю рашучую акцыю проці Кантонскай Арміі з ліквідацыі бальшавіцкай заразы ў сябе дома. А ласьне, атрад войска Чан-Тсо-Ліна ў 100 чалавек заняў бальшавіцкае пасольства ў Пэкіне арыштаваў увесь служачы пэрсанал і агэнтаў быўшых на ўслугах бальшавікоў. У пасольстве былі знойдзены кулямёты і іншы ваенны матэрыял. Частка кампрамітуючага пісьменнага матэрыяла была спалена бальшавікамі ў часе замешкі. Гэткім спосабам было зьнішчана галоўнае гняздо бальшавіцкай заразы ў паўночным Кітаі, проці якога цяпер вядзецца акцыя з Захода і Паўдня.

Нядаўна выехаў з Парыжа цераз Маскву і Сыбір да Пэкіна рэдактар паважнай францускай часопісі „Matin" Заўэрвэйн, каб на мейсцы пазнаёміцца з сытуацыяй і паінфармаваць Эўропу. Перш на перш Заўэрвэйн адведаў дыктатара Паўночнага Кітая маршала Чанг-Тсо-Ліна, які сказаў яму наступнае: „я не хацеў вайны з кантонцамі. Але калі яна пачалася, я павінен давясьці яе да канца. Хачу ачысьціць ад праціўніка ўсю тэрыторыю на поўнач ад ракі Ян-Тсэ Тагды запрапаную ім згоду, і супольнымі сіламі прыступім да вызваленьня Кітая ад чужаземнай няволі Але неабходным варункам для гэтага зьяўляецца парахунак з бальшавікамі Далоў гэтых ворагаў чалавецтва, гэтых подлых загаворшчыкоў, падобных якім дагэтуль сьвет ня знаў і якія карыстаючыся з нядолі азіяцкіх народаў, сеюць сярод іх сваркі, дзеля таго, што ім пашанцавала ў Эўропе. Чаго яны шукаюць у Кітаі. Кітайцы — гэта сяляне, шчасьлівыя, калі маюць кавалак зямлі, якую працавіта абрабляюць. Толькі патрэбны спакой. А гэтыя птушкі праклящьця зьляцеліся да Кітая, дзе німа ні воднага комуніста і грунту для іх, хочуць прышчапіць нам свае тэорыі, якія давялі іх самых да найніжэйшай ступені людзкой драбіны. Маю надзею, што большасьць кантонцаў патрапіць пазбавіцца ад гэтых ворагаў чалавецтва. Камандзір кантонскай арміяй гэн. Шэк ня любіць іх. Я на яго мейсцы ведаў бы, што з імі рабіць".

І далей, зьвяртаючыся да Заўэрвэйна, Чанг-Тсо-Лін закончыў: „Памажыце ж нам дзеля самаго Бога! Тое, што тут разьвіваецца, мае значэньне для цэлага сьвета. Калі, бальшавізм затрыумфуе ў Кітаі, дык затрыумфуе па цэлым сьвеце і ў першую чаргу ў Азіі Чым даўжэй цягнеце, тым цяжэйшае чакае вас заданьне. Францыя павінна разам з Нямеччынай і Польшчай выгнаць бальшавікоў з Эўропы. Наступіў для гэтага найлепшы мамэнт. Напішыце, аб гэтым, каб ведала ўся Эўропа, што сказаў Вам Чанг-Тсо-Лін ад імяні 150 мільёнаў кітайцаў.

Пасьля гэтай заявы зусім зразумелы той крок, які зрабіў Чанг Тсо-Лін у Пэкіне. Ён добра разумее, што ўсё роўна яго не пашкадуюць у выпадку перамогі кантонцаў і Фэнга і што гэта прынясе толькі няшчасьце ўсяму Кітаю. Ен зразумеў, што наступіў апошні мамэнт для рашучай барацьбы з бальшавізмам у Кітаі. Ці цяпер, ці ніколі. Можа быць пачынаюць разумець гэта і вялікія дзяржавы, маючыя найбольшыя ўплывы на Д. Усходзе, а ласьне Японія, Амэрыка і Англія. Газэты паведамляюць, што Чанг-Тсо-Лін рашыўся на гэты крок са згоды дыплёматычнага корпуса вялікіх дзяржаваў у Пэкіне. Малым намёкам на гэта служыць тое, што Японія, Амэрыка і Англія перадалі кантонцам даволі энэргічныя ноты ў зьвязку з падзеямі ў Нанкіне, але на жаль не супольную, а кожная дзяржава паасобна. Гэта дае бальшавікам надзею, што сярод вялікіх дзяржаваў няма цеснай унутранай згоды. А ў такім выпадку бальшавікі чуюць сябе, як рыба ў вадзе. Паводле нямецкіх вестак бальшавікі рашылі адказаць на адкрыты вызаў Чанг-Тсо-Ліна аружным выступленьнем проці Манджурыі. Але сумліўна ці дойдзе да гэтага, і ці ня праглынуць бальшавікі гэтую пілюлю, як і год таму назад, калі Чанг-Тсо-Лін выгнаў з Пэкіна Карахана. Бальшавікі добра ведаюць, з кім можна жартаваць, а з кім не. За сьпіною Чанг-Тсо-Ліна стаіць Японія, якая ня любіць жартаў. Гэта не Англія і не Эўропа, над якою бальшавікі зьдзекуюцца, як хочуць


Узапраўды, што ж робіць Эўропа, калі рашаецца яе лёс у Кітаі? Што робяць у гэты рашучы мамэнт Нямеччына, Францыя і Польшча, да якіх зьвяртаецца прадстаўнік 150 мільёнаў кітайцаў з просьбай памагчы яму ў супольнай акцыі і прапануе выкінуць бальшавікоў з Эўропы?

Нямеччына вельмі ўстрывожана паступкам Чанг-Тсо-Ліна. Нямецкія газэты пішуць, што ня можа быць, каб нямецкі дыплёматычны прадстаўнік даў сваю згоду па разбурэньне радавага пасольства ў Пэкіне. Сацыялістычная газэта „Уперад" абураецца гэткім нячуваным паступкам ў эўрапэйскай палітыцы на Д Усходзе. Гэтыя абурэньні немцаў зусім зразумелыя, калі прыняць пад увагу, што на Д Усходзе могуць пацярпець паражэньне іх хаўрусьнікі, якія ім патрэбны, пакуль вядзецца скрытая барацьба з пераможцамі. Нарэшце калі-б пачалася рашучая барацьба з бальшавізмам, дык хацяй — нехацяй немцам прыйшлося бы выйсьці з сваей нявыразнай пазыцыі, адносна бальшавікоў і заняць той ці другі бок. Хаця ад Нямеччыны і ня можна вымагаць іншай палітыкі, калі мець на ўвазе тое, што яна страціла пасьля вайны на карысьць пераможцаў, заінтэрасаваных у Кітаі.

Менш зразумела тактыка Францыі, якая як раз вядзе цяпер гутаркі з бальшавікамі ў Парыжу. І быццам на гэты раз перагаворы маюць больш памысны ход. Дасягнута згода адносна сплаты бальшавікамі царскіх даўгоў Францыі, якія яны ня плацяць дагэтуль нікому. Для іх вельмі важна, каб у гэты мамэнт, калі рашаецца іх лёс на Д. Усходзе і творыцца агульны антыбальшавіцкі фронт ў Эўропе, пасеяць сварку паміж эўрапэйскімі дзяржавамі. Нямеччына на іх баку. А калі яшчэ перацягнуць на свой бок Францыю і Польшчу, дык пляны Англіі будуць разбураны. І ў тым, што Францыя шукае зблізэньня з Нямеччынай і Радавай Расеяй, вінавата сама Англія, пазваляючы Італіі безкарна гаспадараваць на Балканах і Бл. Усходзе. Заключэньнем трактату дружбы з Вэнгрыяй Італія зусім разьбівае Малую Антанту, якая разам з Вялікай Антантай была раней лепшай гарантыяй эўрапэйскага міру і бальшавіцкай бясьпекі. Калі да гэтага далучыць яшчэ тое, што Польшча гэтак сама вядзе перагаворы аб гарантыйным пакце з бальшавікамі, дык будзе відаць, як абмыліўся Чанг-Тсо Лін у сваіх надзеях, калі радзіў цераз Заўэрвэйна, каб Францыя разам з Польшчай і Нямеччынай вытурылі бальшавікоў з Эўропы. Застаецца ў цэлай Эўропе толькі адна Англія, якая мусіць весьці барацьбу з бальшавікамі, дзеля таго, што ад вынікаў гэтай барацьбы залежыць яе далейшы лёс. Але і яна ня можа разьвіць поўнай акцыі дзеля ўнутранага палітычнага крызісу. Англійскі ўрад унёс да парлямэнту закон, абмяжоўваючы права агульных забастовак работнікаў. У адказ на гэта апошнія рашылі пачаць энэргічную барацьбу з урадам. Гэткім чынам і тут прадстаўляецца памысны грунт для бальшавіцкай заразы. Такі абраз прадстаўляе ўся Эўропа, калі рашаецца яе лёс у Азіі.

N.

Вайна у Кітаі.



Карта кітайскага тэатру вайны. На карце палажэньне ваюючых армій паказана к пачатку красавіка.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ЗАБАСТОЎКА Ў ДАМБРОВЕ. У сувязі з канфліктам паміж упраўленьнем копі Банковай і работнікамі на грунце звальненьня са службы 3 работнікаў — успыхнула забастоўка, да якой прыступіла 2000 асоб Да забастоўкі прылучыліся таксама работнікі копі Гамнэр.

ВЕРБУНАК АХВОТНІКАЎ. Да Варшавы прыбыў прадстаўнік арміі Чанг Со Ліна Тсі-Пон-Хан з мэтай вербунку ахвотнікаў у армію манджурскага дыктатара.

Плата ахвотнікам такая: 150 даляраў аднаразова і па 100 даляраў месячна. Патрэбна ўсяго 10,000 ахвотнікаў.

З КАМІТЭТУ ЭКСПЭРТАЎ ПА СПРАВАМ МЕНШАСЬЦЯЎ. Апошняя сэсія камітэту экспэртаў па справам нацыянальных меншасьцяў трывала ад 4 да 9 красавіка. Удзел у працах прымалі: Лявон Васілеўскі, др. Гэнрык Лёвэнгэрц і начальнік аддзелу меншасьцяў пры міністэрстве ўнутранных справаў п. Сухэнэк-Сухэцкі, як сэкрэтар.

Галоўнай справай сэсіі была справа зьмены закону аб нядзельным адпачынку

Апрача таго камісія займалася склікяньнем да Варшавы анкеты ў справе дзяржаўнай адміністрацыі трох палуднёва-усходніх ваяводзтваў. Вучасьнікі анкеты маюць сфармуляваць два пытаньня:

1) Спасьцярогі і ўвагі, якія насоўваюцца насяленьню, зварачываючымся да ўрадаў аб дзейнасьці гэтых урадаў і духу дзяржаўнай адміністрацыі.

2) Трэбаваньні гэтага насяленьня ў кірунку паляпшэньняў або распараджэньняў, якія магчыма правесьці ў граніцах істнуючых законаў

Установлены прозьвішчы вучасьнікаў анкеты і ўсе падробнасьці, зьвязаныя з яе склiканьнем.

Камісія пазнаёмілася ўрэшце з аст тнімі распараджэньнямі ўлады ў галіне заспакаеньня патрэб гаспадарчых і культурных нацыянальных меншасьцяў, спэцыяльна прымаючы пад увагу справу школьніцтва украінскага і беларускага.

ЗАБОЙСТВА ПРЭЗЫДЭНТА м. ЛОДЗІ 14 красавіка прэзыдэнт м. Лодзі М. Цынарскі вышаў з сваёй кватэры. Праз мінуту адзін з кватэруючых у гэтым доме, пачуў крык: „Злодзеі! Ратуйце!“ Кінуўшыся ў ніз на сходах ён убачыў Цынарскага, які ляжаў на самым нізе, а таксама уцякаючага мужчыну. Прэзыдэнт быў ранен нажом у грудзі і зараз-жа памёр.

Аб забойстве прэзыдэнта вядомы гэткія падрабнасьці Калі прэзыдэнт сходзіў у ніз, заўважыў—што нейкія асобы маюць замер прайсьці праз дзверы, выходзячыя на сходы да магазыну Убачыўшы прэзыдэнта адзін са злодзеяў падскочыў і ўдарыў яго нажом у грудзі.

АРЫШТ ЗАБОЙЦЫ КУРАТАРА САБІНСКАГА На чэхаславацкай граніцы пры спробе перайсьці граніцу арыштаваны нейкі Васіль Атаманчук, трэці вучасьнік забойства куратара Сабінскага ў Львове. У сувязі з гэтай справай арыштавана яшчэ некалькі асоб.

КАТАСТРОФА. 6 красавіка на рудніках „Кацярына“ ў Сасновіцах здарылася катастрофа. Работнікі, занятыя кіданьнем да мартэнаўскае печы старага дроту, не заўважылі, што сярод дроту знаходзіцца граната. Страшэнным выбухам быў забіты 1 работнік і 12 ранена.

ЧУТКІ АБ ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІХ ПЕРАГАВОРАХ. Англійская газэта „Daily News“ у паведамленьнях з Коўні падае сэнсацыйную вестку аб выражэньні літоўскім урадам згоды на распачацьце палітычных і гаспадарчых перагавораў з Польшчай.

За граніцай.

НАПАД НА САВЕЦКАГА КОНСУЛА. 9 сакавіка ў Кенігсбэргу (Нямеччына) на вуліцы быў зроблены напад на Савецкага консула Кантара. Невядомыя асобы распачалі з консулам лаянку і затым пабілі яго кіямі. Кантар атрымаў цяжкія параненьні.

Некалькі чалавек паліцыя, у сувязі з гэтым, арыштавала.

ПЕРАВАРОТ Ў ЧЫЛІ У Чылі (Амэрыка) адбыўся пераварот. Апіраючыся на армію ваенны міністар Ібанэс абвесьціў сябе дыктатарам і адсунуў ад улады прэзыдэнта.

НОВЫ ПРЭЗЫДЭНТ ЛАТВІІ. Адбыліся выбары новага латвійскага прэзыдэнта. Выбраны Г. Зэмгалі, які з агульнага ліку 100 галасоў, атрымаў 73.

ФРАНЦУСКА — САВЕЦКІЯ ПЕРАГАВОРЫ. Ужо даволі даўно распачаліся савецка-францускія перагаворы ў справе прызнаньня Саветамі даўгоў.

Францускае міністэрства замежных справаў паведамляе, што паміж францускай і савецкай дэлегацыямі падпісаны пратакол, намячаючы аснаўныя лініі будучай умовы. Аканчальнага рашэньня ў справе штогодніх плацяжоў, а таксама вялічыні прадстаўляемых Саветам крэдытаў — яшчэ німа.

Падпіша ўмову сам Чычэрын. У сучасны мамэнт перагаворы перарваны і распачнуцца пасьля Вялікадня.

АМЭРЫКАНСКІ ПАВЕТРАНЫ ФЛЕТ. Памоцнік статсэкрэтара (міністра) па вайсковым справам Давідсон паведаміў, што да 1928 году Злучаныя Штаты будуць мець 2000 баявых аэрапляпаў з 1650 афіцэрамі 15,000 жаўнерамі.

НАПРУЖАНАЯ СЫТУАЦЫЯ Ў ЛІТВЕ З Коўні паведамляюць, што магчымым зьяўляецца кампраміс паміж Сялянскім Саюзам і Народнай Партыяй. Спробы ў гэтым кірунку распачаў нядаўна прыехаўшы з Лёндану Гальванаўскас. Адбываюцца ў гэтай справе нарады, якія маюць давесьці да паўстаньня новага ўраду.

Высьненьне сытуацыі мела наступіць на апошнім паседжаньні літоўскага Сойму, на якім Вальдэмарас павінен быў адказаць на інтэрпэляцыю ў справе арышта пасла Паяуіса.

Калі-б Сэйм ухваліў вотум недаверыя— быў бы магчымы роспуск Сойму, што ў рэзультаце магло-б давесьці да вайсковай дыктатуры, да якой імкнуцца ўжо доўгі час вайсковыя колы

УЗНАЎЛЕНЬНЕ ЛАТВІЙСКА-САВЕЦКІХ ПЕРАГАВОРАЎ. Прэса даведываецца з пэўных крыніцаў, што міністар замежных справаў пастанавіў пасьля паразуменьня з соймавай камісіяй узнавіць перагаворы з Саветамі аб пакце бясьпекі, яшчэ перад выездам латвійскае дэлегацыі да Масквы.

БАІ Ў ШАНХАІ. У кітайскім квартале Шанхая дайшло да баёў паміж кантонскім войскам і бастуючымі работнікамі комуністамі. Уваружаныя комуністы прабавалі атакаваць галоўную кватэру кантонскага войска, каб зьвянуць раней адабраную амуніцыю. На чале ішлі кабеты і дзеці маючы надзею, што кантонскае войска ня будзе ў іх страляць. Але кантонцы адкрылі вагонь, прычым было шмат забіта і больш 200 асоб ранена; сярод іх шмат кабет і дзяцей. Атака была адбіта. Пасьля гэтага былі распушчаны ўсе прафэсыянальныя саюзы.

ШПІЁНЫ КОМУНІСТЫ Ў ФРАНЦЫІ. Апошняя сэнсацыя Францыі — раскрыцьце сыстэматычнага шпіёнства, якім займаліся другі сэкрэтар парыжскага аддзелу комуністычнай партыі Дадо, кіраўнік комуністычнай ячэйкі ваенных заводаў і 2 іншыя выдатныя камуністы. Усе трое арыштаваны.

Арышт гэтых комуністычных агітатараў знаходзіцца ў сувязі з крадзежай шмат якіх сэкрэтных дакумэнтаў, маючых адносіны з арсэналам.

РАССТРЭЛ РАСЕЙСКІХ АФІЦАРОЎ. Савецкія „Известія“ паведамляюць, што ў баю пад Сундзяном, які папярэдзіў заняцьце Шанхаю, кантонцы ўзялі ў плен 4000 жаўнераў белых армій, у тым ліку 26 расейскіх афіцароў, складаючых каманду бранявога цягніка. Усе расейцы былі расстраляны на месцы.

ПРАВАЛ САВЕЦКІХ ПЛЯНАЎ У ЭЎРОПЕ Англійская газэта „Дэйлі Мэйлі“ паведамляе аб няудачы бальшавіцкага пляну падняць горных работнікаў Францыі, Нямеччыны і Злуч. Штатаў і прымусіць іх адначасова абвесьціць агульную забастоўку. Забастоўка была вызначана на панядзелак 28 сакавіка і ў памянёных дзяржавах павінна было прыпыніць працу 1,100,000 чалавек. Але аб забастоўцы даведаліся прамыслоўцы і пасьпелі прыняць адпаведныя меры. Гэтак францускія работнікі ўжо пайшлі на згоду з прамыслоўцамі. Тое самое робіцца і ў Рурскай вобласьці ў Нямеччыне. Забаставала толькі 200,000 работнікаў у Амэрыцы. Гэткім чынам савецкі плян арганізаваць агульную забастоўку праваліўся.

АГІТАЦЫЯ ЗА АДАРВАНЬНЕ УКРАІНЫ АД САВЕТАЎ. Часопісь „Політіка“, афіцыёз югаславянскага ўраду паведамляе, што на Савецкай Украіне вельмі ўзрасла прапагандная дзеяльнасьць за адарваньне Украіны ад Савецкага Саюзу. „Політіка“ падае зьмест праклямацыі, якая масава пашыраецца на Савецкай Украіне. Праклямацыі заклікаюць да помсты за Петлюру і звальненьне ад бальшавікоў. Юга-славянская часопісь трымаецца таго пагляду, што гэтую агітацыю пашыраюць англійскія і італьянскія агэнты.

Я. Шыбка.

Узрост насяленьня і эміграцыя Польшчы.

Здаецца няма больш балючага пытаньня ў Польшчы, як праблема прыроста насяленьня і эміграцыя. У той час, як, напрыклад, для выраджаючайся Францыі нармальны прырост насяленьня зьяўляецца нацыянальным ідэалам, у Польшчы гэта амаль ня лічыцца найвялікшай „небясьпекай“.

Калі ў пераможца немцаў францускага маршалка Фоша спыталіся ў часе яго візыта ў Варшаве, што яму найбольш спадабалася ў Польшы, дык ён адказаў: „Дзеці. Прышласьць Польшчы ў дзецях“

Чаму-ж гэта такая разьбежнасьць у разуменьні: адныя лічаць шчасьцем тое, што для другіх зьяўляецца „небясьпекай“

А зусім проста: Польшча пры здаровым павялічэньні насяленьні і пры наліччы ўсіх даных для памыснага эканамічнага разьвіцьця дзяржавы ня ўмее выкарыстаць гэтых магчымасьцяў. Адсюль гэтакая запярэчнасьць: з аднаго боку прыемна быць вялікай дзяржавай, з якой больш лічыліся-бы іншыя дзяржавы, а з другога, для часовага дзяржаўнага спакою карысна не павялічаваць, а зьменшаць прырост насяленьня.

Цікава прыглядзіцца бліжэй да гэтакай унутранай „небясьпекі“ Польшчы і да таго, як польскі ўрад змагаецца з ёй. Польскі праф Кшыжаноўскі ў сваёй кніжцы пад назовам „Паўпэрызацыя Польшчы“ піша што ў 1914 г. перавышка ўрадзін пад сьмяротнасьцю на цяперашнім абшары Польшчы раўнялася 1, 5% ці 450,000 асобаў у год. З гэтага ліку эміґравала 150,000 і заставалася дома 300,000. Ён лічыць менш — больш такі-ж прырост і цяпер. У параўнаньні з іншымі дзяржавамі, Польшча стаіць амаль што не на першым месцы па прыросту насяленьня. Паводле даных, сабраных Ст. Дзевульскім (Kwestja emigracji „Ekonomista“) толькі адна Галяндыя стаіць вышэй Польшчы ў адносінах павялічэньня насяленьня, бо мае 1,6 проц. Далей ідзе Польшча 1,5 проц Нямеччына— 1, 5 проц. Японія—1,5 проц. Амэрыка—1,5 Расея—1,5 проц. Данія і Італія — 1,3 проц. Фінляндыя—1,1 проц, Англія—1 проц, Швэцыя і Швэйцарыя —0, 9 проц. Бэльгія—0,8 проц. Ірляндыя—0,6 проц, і нарэшце Францыя— 0,06 проц, ці адну 25-ю частку прыроста Польшчы. Адсюль зразумела, чаму так маршалак Фош захоплены быў польскімі дзяцьмі.

Як бачым адсюль, у Польшчы яшчэ ня так вялікі прырост насяленьня ў параўнаньні з іншымі вялікімі дзяржавамі, як Нямеччына,

Бедны шпак.

(З Сыракомлі).

„Дзядзенька мілы, прадай мне шпака!“
Хлапчук так на рынку прасіў лясьніка.
Зірнуў той: на малым, бедным дзіцяці
Рваная вопратка, лата на лаце...
—„Прадаць тут ня штука, ды дзіч дарагая,
Грошай ці хопе? Дый ежа такая
Хіба не падходзіць сталу бедняка?..“
З пагардай буркнуў ён у бок хлапчука.
—„Два злоты! І помні, з цаны не спушчаю!“
—„Пабойся ты Бога! Два злоты я маю,
Ды гэта ўсе грошы .. А з іх мне патрэба,
Купіць і занесьці да хаты хунт хлеба;
Бо брат мой маленькі, бедны дзіцёнак,
Вылезшы толькі—што з люлькі й пялёнак
У хаце халоднай сядзіць, горка плача,
Хлеба ад раніцы сяньня ня бачыў...
А далей — патрэба ісьці мне ў аптэку
Купіць там для мамкі павінен я леку.
Бедная сохне, бы сьвечка гарыць,
Мусіць ня доўга на сьвеце ёй жыць..
Доктар мікстуры вось ёй прапісаў,
Толькі дзічынай карміцца казаў...
Татка мой сьлёсар. Ды працы ня мае.
Гора—нуда нас усіх заедае..
За злот, малю Богам, шпака мне аддай!
Даплоце табе Ен, ты пойдзеш у рай.
Інача й ня хопіць што маю грошай
На хлеб і лекарствы для мамкі маей!“
Са сьмехам хлапцу тут лясьнік адказаў:
—„Дальбог я ня ведаў, дагэтуль ня знаў,
Каб жонкі рабочых, з якойсь там прычыны,
Бы нейкія пані, карміліcь дзічынай!
Рэцэпт я вось маю для мамкі тваей:
Заместа дзічыны — гарэлкі хутчэй
Хай выпье кялішак, а то і другі.
Хворасьць уся міне, ня будзе й тугі.
Два злоты, ня меней, кажу не на жарты!
За злот жа й набою траціць ня варта.
А болей ня маеш, дык прэч адхадзі!“
—„Лясьнік, а лясьнік! сюды, брат, хадзі!“
Пан гэтак з карэты пазваў лясьніка:
—„Колькі ты хочаш, кажы за шпака?“
—„Пяць злотых паночку... І то толькі в м“.
„Дзядзенька, злоты з паловай я дам!
Урэшці і два дам!“—хлапчук адазваўся:
Ты-ж столькі прасіў і са мной таргаваўся.
Ты-ж слова мне даў, павінен стрымаць
„Бяры, бо я часу ня маю чакаць!“
А пан у карэце са злосьцяй рагоча:
—„Ха—ха! Бачыў? .. шчанюк нейкі...хоча
Дзічыну з пад носу ў мяне падхапіць!“
„Паночку вельможны дазвольце купіць!...
Прашу вашай ласкі“.. хлапец ўзмаліўся.
—„Ласкі? Каму?“ пан шчыра зьдзівіўся.
„Дазвольце мне пане, апошніх два злоты
Аддаць за дзічыну. У мамкі сухоты,
Ей доктар казаў“...
Тут пан той з карэты,
Вочы прышчурыўшы кажа на гэта:
—„Я з рынку, браточак, цябе не ганю,
Што матку кахаеш,—шаную й цаню.
Аднак-жа каб зьгінуць меў увесь сьвет—
Я шпакам дапоўню свой сяньня абед!
Смачная штука! У роце аж тае!
Вы-ж жабракі, вы нэндза сьвятая,
Ня можаце гэтага нат' зразумець
Чаго-ж на дзічыну вам гэту ляцець!
Ідзі-жа да хаты да маткі сваей,
Ідзі без шпака, але з радай маей,
Каб ела капусту, кашу ды сала,
А дзеля смаку — перцу больш клала.
І будзе здарова праз век увесь свой.
Шпака-ж не аддам ей. Pardon, братка мой!“
Пан кінуў паперку ў руку лясьніка
І шпарка ад'ехаў, забраўшы шпака.
Хлапец з плачам —енкам пабег за карэтай...
А панскі хурман, убачыўшы гэта:
--„Ты што гэта“--крыкнуў--„прыліп--увязаўся,
Ці мала ласкавым мой пан аказаўся?
Дык вось-жа табе!“ І сьвіснуў каньчук,
І крою залiўся наш бедны хлапчук...
Сьмяецца лясьнік:„Які ты нязд ра!
Чаго задаешся? ці-ж пан табе пара?
І думаў, а як-жа дурною галоўкай
З панам цягацца сваёй двузлатоўкай!
Ідзі вось да хаты бяз большай тугі,
А я пайду цяпнуць кялішак — другі!“
Далёка карэта багатая скача,
Хлапец шчэ стаіць ўсё на мейсцы і плача
Што яму трэба? Чаго ён чакае?
Лясьнік п'е гарэлку, весела сьпявае...
У дзень нек пануры,
Раз м спраўляліcь па трох аж хаўтуры.
У немаляванай, сасновай труне,
На прасьценькім возе, аб тошчым кане,
Зьмёршая сьлесара жонка ляжыць...
Ей не за што было дзічыны купіць
Каб сілы набрацца, хваробу змагаць...
За ёю—калоду другую відаць:
У ей на спачынах вязьлі лясьніка.
Ен пану прадаў не аднога шпака,
За панскія грошы—ён надта куціў
Аж пьяны са стрэльбы сябе падстраліў.
Дзівіўся ўвесь натаўп з апошняга гроба,
Ляжала ў ім важная відна асоба.
Так х дамавін—ня убачыш ніколі!
У ёй на магільны спачынак, паволі,
Пана вязьлі, што калісь хлапчука
Скрыўдзіў так моцна, забраўшы шпака.
Са сьмерці ягонай усяк падзівіўся:
Ен косьцяй шпака за сталом падавіўся...
Усе трое прадсталі на страшным судзе,
Дзе кожны адчот дасьць за ўсе справы сваe,
Там ў кнігу быцьця анёл без сумліву
Упісаў аб шпаку ўжо аповесьць праўдзіву..

Б. Друцкі.

Амэрыка, Расея і Японія, каб з гэтага прыходзілася рабіць нейкую дзяржаўную „небясьпеку“ Прынамсі гэтага ня робіць ні Амэрыка, ні Нямеччына, ні нават Расея. Тым часам Польшча дзеля таго, што перажывае хранічны эканамічна-фінансавы крызіс, змушана шукаць шляхоў выхаду з гэтай „небясьпекі“. І знаходзіць яго толькі ў эміграцыі, г. зн. як раз у тым, што найбольш шкадліва як для цэлай дзяржавы, гэтак сама і для саміх эмігрантаў, як мы гэта ўбачым ніжэй. Для дзяржавы шкадліва дзеля таго, што аслабляецца яе фізычная сіла і баяспасобнасьць бо іншыя дзяржавы, як Францыя, Амэрыка, інш. прымаюць з заграніцы, у тым ліку і з Польшчы, толькі здаровых моцных і працаздольных работнікоў мужчынаў, у той час як дома застаюцца толькі інваліды, ды якія небудзь недалугі. Выяжджаючы да Францыі ці Амэрыкі, польскія эмігранты падлягаюць болей строгаму доктарскаму агляду, чым пры ўступленьні на вайсковую службу. І ў выўпадку вайны Польшча ня зможа скарыстаць у поўнай меры сваіх эмігрантаў, як гэта магла-бы зрабіць пры наліччы іх пад рукамі ў сябе дома Але ў гэтым выпадку ўваходзяць у рахунак, здаецца зусім другія меркаваньні, з якіх адно зьяўляецца палітычнага, а другое — эканамічнага характару. Высяляючы з межаў дзяржавы безработны пралетарыят, урад збаўляецца ад небясьпечнага ў палітычным сэнсе элемэнта, а скарб — ад неабходнасьці траціць на іх лішнія грошы. Толькі сплавіўшы за граніцу ўсю рэзэрву безработных, можна спакойна цягнуць з адкладаньнем правядзеньня зямельнай і сацыяльнай рэформы і вясьці далей тую гаспадарчую палітыку, якая з кожным днём прыбліжае ўсю дзяржаву к палітычнай і эканамічнай катастрофе.

І ў той час, як, напрыклад, у Нямеччыне насяленьне павялічылася з 1919 да 1926 г. на 3,300,000 чал., дасягнуўшы 63¼ мільёнаў, калі нават насяленьне Радавай Расеі павялічылася пасьля 1922 г. на 12 міл. дасягнуўшы агульнай лічбы 143 мільёнаў, ня гледзячы на даўгую ўнутраную вайну і страшэнную сьмяротнасьць ад голаду з поваду неўраджаю, у Польшчы насяленьне з каждым годам зьменшалася, ня гледзячы на такі прырост. Паводле даных „Rocznika Statystycznego Rz. Pol.“ 30 верасьня 1921 г. насяленьне Польшчы дасягала 27,177,000 асоб, 1 студня 1923 г. — 28,155,000 асоб, а 1 студня 1925 г. — 27,896,000, хаця агульна лічыцца ў нас ўвесь гэты час 30 мільёнаў жыхароў. Вось дзеля чаго ў нас „казённыя“ аптымісты бачаць вельмі карысную эканамічную сытуацыю, бо афіцыяльна зарэгістраваных безработных ёсьць каля 200,000, хаця пасол сойму Гэрман Діаманд (P. P. S) піша ў „Robotniku“ (N 76), што безработных — такіх, якія засталіся ў краю і такіх, якія эміґравалі, маем больш мільёна“.

Гэта лічба, нават для 30 мільённай дзяржавы, завялікая.

Цяпер цікава будзе пабачыць, як гэта пры такім высокім прыросьце насяленьня агульная лічба не павялічаецца, а зьменшаецца. Пасьля вайны хлынулі да вольнай бацькаўшчыны палякі як з Амэрыкі і другіх краёў, гэтак сама рэпатрыянты з Расеі і Нямеччыны Гэткім чынам у 1920 г. з Амэрыкі прыехала ў Польшчу—70,000, у 1921 г. 78,000 асоб. Але іх так на вольнай бацькаўшчыне спатыкалі з іх далярамі, што амаль ня ўсе пачалі прасіцца аб паваротным выязьдзе да Амэрыкі, у выніку чаго у 1922 г. рээмігруе да Польшчы толькі 11,000, а ў 1923 г. — 6,693 і ў наступныя гады зусім спыняецца. Вось што піша аб гэтым зьявішчы консэрватыўны „Kur. Warsz.“ (№ 355—1925 г.)

...„Гэта сьцьвярджае, што палякі з Амэрыкі не знайшлі ў Польшчы таго, чаго шукалі. Знайшлі тут іншыя варункі працы, палітычную барацьбу і такія фінансавыя адносіны, што іх даляровыя зьберажэньні былі зусім зьнішчаны. Многія рээмігранты, змарнаваўшы зьберажэньні на ўсё жыцьцё і ў баязьні перад бедвасьцю, чакаючай іх у краю, за рэшткі грошаў ці пры помачы сваякоў, застаўшыхся ў Амэрыцы, вярнуліся за акіян з расчараваньнем і перасьцярогай для іншых. Цяпер устанавіўся ўжо ў Амэрыцы погляд, што паварот да роднаго краю бязмэтны. Гэткім чынам — піша газэта, — 4 мільённая польская эміграцыя ў Амэрыцы ёсьць для Польшчы згубленай, калі гутарка ідзе аб надзеі на іх прыезд“.

Даволі прыпомніць аб цэлым радзе бандыцкіх забойстваў „амэрыканцаў“ з-за даляраў, ці той шкодзе, якую панясьлі апошнія ў часе інфляцыі польскай маркі і банкруцтва сотняў банкаў, як Bank dla Handlu i Przemysłu, меўшы да 120 філіяў ў краю і заграніцай, каб уцяміць сабе гэту горач, якую вынясьлі польскія рээмігранты з сваей бацькаўшчыны.

Апрача гэтага ў пэрыёд 5 гадоў вярнулася з Расеі ў Польшчу 1,216,000 рэпатрыянтаў, выехаўшы да Расеі ў часе вайны перад нямецкай акупацыяй. З іх на польскую нацыянальнасьць прыходзіцца 36,5 прац., беларусаў 39,5 прац., украінцаў 10 прац., расейцаў 9,8 і жыдоў 2,7 прац. З гэтага параўнаньня відаць, наскольні несправядлівы шум польскіх антысэмітаў, што быццам расейскія жыды „залімаюць Польшчу“, у той час, як свае жыды, ў Польшчы складаюць 3 мільёны, ці больш як 11 прац. усяго польскага насяленьня.


І вось, як толькі скончылася вайна і адкрыліся граніцы, а ўнутры пачало расьці безрабоцьце, перад польскім урадам прадстала грознае пытаньне, куды дзяваць гэты патрэбны толькі ў часе вайны і непатрэбны, а нават і набясьпечны элемэнт у мірны час. І было знойдзена, што найлепшым выхадам зьяўляецца эміграцыя, як часовы выезд за граніцу. І пачаўся гвалтоўны „экспорт“ людзкога тавару на ўсе сусьветныя рынкі, дзе толькі быў на яго хоць які „спрос“.

У пачатку найбольшая хваля польскай эміграцыі кіравалася ў Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі. Пры гэтым трэба занатаваць, што гэтак званая заморская эміграцыя дзеліцца на два разрады: адны едуць на пастаяннае, а едлае жыцьцё (да Амэрыкі), а другія—на часовае, ці сэзановае (Эўропа).

Гэткім чынам у Злуч. Штаты Амэрыкі вызміґравала: у 1920 — 21 г. 21,000 палякоў, 119,000 жыдоў і 2,000 украінцаў. Гэта быў той пэрыяд, калі амэрыканскія палякі, палаўшыя патрыётызмам, імкнуліся на вольную бацькаўшчыну. Ў 1921 — 23 г. выехала туды ж 19,000 палякоў, 104,000 жыдоў і 2,000 украінцаў. Гэтакі наплыў імміграцыі з Эўропы, асабліва з Польшчы і Італіі, застрашыў амэрыканцаў і амэрыканскі Ўрад устанавіў гэтак званыя „квоты“ для эміграцыі з кожнай дзяржавы і на кожны год. Гэта „квота“ для Польшчы складае, пачаўшы з 1924 г. 6,000 іммігрантаў у год.

(*Працяг будзе*).

Італьянска-вэнгерскае паразуменьне.



Прэм'ер ураду фашыстаўскае Вэнгрыі Бэтлен, які некалькі дзён таму назад падпісаў умову прыязьні Італіяй.

Напярэдадні дыктатуры у Літве.

З Коўні паведамляюць, што старшыня Рады Міністраў Вальдэмарас падпісаў дэкрэт аб роспуску Сойму. Чакаецца абвешчаньне вайсковае дыктатуры.

Пасол з Лёндану Гальванаўскас стараецца стварыць коаліцыйны кабінэт.

Усё робіцца пад націскам Англіі.

С. С. Р. Р.

Рэвалюцыйная законнасьць.

Прыбыўшы з рэвізыйнае падарожы па Узбекістану паўнамоцны політупраўленьня пры рэвваенсавеце партыяц Міхайлаў парушыў перад ЦКВКП. пытаньне аб захаваньні хаця-б найменшай рэвалюцыйнай законнасьці начальнікамі карацельных атрадаў у Узбекістане, сваёй дзеяльнасьцю падымаючых насяленьне проці савецкае ўлады.

Жыхары кішлакоў і гандлёвых пунктаў, па заяве Міхайлава, байкатуюць вайсковыя часьці, не даючы ім прадуктаў, фуражу і не даючы ім праваднікоў і пераводчыкаў у экспэдыцыях проці басмачоў. Безпадстаўныя расстрэлы, рэквізыцыі карацельных атрадаў і перавышэньне ўлады прымушаюць насяленьне пры прыбліжэньні атрадаў хаваць маемасьць і ўцякаць са скатом у горы. Усё гэтае нятолькі затрудняе барацьбу з басмачаствам (паўстанцамі), але узмацняе іх, бо насяленьне бачыць у іх сваіх абаронцаў.

Нездаваленьне партыйцаў.

У Бранску 18 сакавіка адбылася дазволеная Масквою губэрнская канфэрэнцыя партыйцаў ад станка. Пасьля дакладаў аб міжнародным і ўнутраным палажэньні распачалася ажыўленая дыскусія, падчас якой вучасьнікі канфэрэнцыі вельмі войстра крытыкавалі дзеяльнасьць ураду і цэнтральнага камітэту партыі. Прынятая аграмаднай большасьцю галасоў рэзалюцыя, констатуючы цяжкі гаспадарчы крызіс, узрост безрабоцьця, вялікую нястачу фабрычных тавараў на вёсцы і нездаваленьне сялян, якое усьцяж расьце, якія азлаблёны на работніцкую клясу, — прапануе правадырам компартыі вырашыць гаспадарчую і эканамічную праблему шляхам запрапанаваньня больш здольным сілам краю, вонкі іх палітычных паглядаў, прыняць удзел у дзяржаўным будаўніцтве.

Скандал у судзе.

Вялікі скандал меў мейсца 9 сакавіка ў народным судзе горада Феадосіі, дзе разьбіралася справа матросаў госпараходства па абвінавачаньню іх у зробленым дэбошы пры перавыбарах мясцовага профсаюзу воднікаў. Абвінавачаныя лікам 16 чалавек, з якіх 5 комсамольцаў, зьявіліся на паседжаньне суда зусім п'янымі і надчас ходу працэса адмовіліся падыходзіць да суда для даваньня паказаньняў, заявіўшы, што яны будуць адказываць, з прычыны хвараблівага стану іх здароўя, з мейсц на ўсе пытаньні судзьдзі, з чым апошні прымушаны быў згодзіцца. Падчас допросу сьведкаў матросы прыступілі да расьпіцьця гарэлкі і на ўвагу судзьдзі спыніць гэта, матрос Крыменка адказаў:— „Ну, ты партыйная рожа, прапусьці з намі шклянку за савецкую ўладу“. Абураны судзьдзя загадаў па тэлефону выклікаць міліцыю і спыніў пасяджаньне. Распараджэньне судзьдзі выклікала азлабленьне матросаў, якія з лаянкаю кінуліся да стала. Часьць матросаў пачало біць судзьдзю і заседацеляў, а іншая схапіўшы ўсе паперы зьнікла. Прыбыўшы атрад міліцыіі мог толькі канстатаваць разгром камэры, былі затрыманы толькі 2 матросы, якія з прычыны ап'яненьня не маглі пакінуць залі суда.

Скрадзена паутара мільена злотых.

Уначы 13 красавіка паштовы асыстэнт у Каралеўскай Гуце Кэслер атрымаў пачку з грашыма, у якой знаходзілася 3000 банкнотаў па 500 зл. высланую аддзелам Польскага Банку ў Седльцах да аддзелу Польскага Банку ў Каралеўскай Гуце. Пачка па перанясеньні да паштовага ўраду была зачынена ў касе, з двумя замкамі і ключ ад аднаго меў Кэслер, ад другога іншы паштовы ўрадовец.

А 4 гадзіне Кэслер скіраваўся за поштай з наступнага цягніка, прычым было заўважана, што ен нясе падарожную торбу. Атрымаўшы пошту ён загадаў „возьным“ аднесьці пошту да ўраду і сказаў што за гадзіну зьвернецца. Больш Кэслера ніхто не бачыў. У касе грошаў не знайшлі. Прыпушчаюць, што Кэслер уцек да Нямеччыны.

Паштовая ўлада зьвярнулася з просьбай аб помач да паліцыі ў Варшаве, міністэрстваў справаў унутраных і заграмічных. Вызначана за выкрыцьце зладзея 4 проценты ад скрадзенай сумы г. е. 60,000 зл. Заарыштаваны амаль ўсе іншыя паштовыя ўрадоўцы ў Каралеўскай Гуце.

Хвароба румынскага караля.



Цяжка захварэўшы румынскі кароль Фэрдынанд.

„Погром — в порядке дня“

Пад такім загалоўкам рыжская „Сегодня“ (N 459) падае за бальшавіцкаю прэсай фактычныя даныя пра вялікі ўзрост антысэмітызму ў Бальшэвіі. Адкрыта называюць, што антысэмітызм пашырае сам „вярхоўны“ Длугашвілі—Сталін. Бальшавіцкая прэса поўна фактаў пабіцьця і забойства жыдоў „Красная газэта“ падае, што на фабрыцы „Равенства“ ў Петраградзе комсамолец Арцюшэнка, працуючы разам з жыдом прычапіўся да яго і з крыкам: „Бій жыда“ выбіў яму зуб і расьсек вусны.

Падобны выпадак здарыўся і ў „Сев. судоверфі“ ў фабрычнай сталоўцы. Работнік Войцеў вымагаў ад работніка — жыда Сіма1оўскага, каб той уступіў яму свае мейсца за сталом. Калі-ж той адмовіўся, Войцеў з дзікім крыкам: „А жыдзюга, пракляты“! загнаў яму відэлец у грудзі.

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Адшкадаваньне за зямлю асаднікаў.

Рада міністраў на адным з апошніх сваіх паседжаньняў разглядала законапраэкт аб адшкадаваньні за абшарніцкія нярухомасьці занятыя для ваенных асаднікаў Адшкадаваньні за адабраную зямлю будуць выплачывацца ў даўгавых забавязаньнях скарбу, якія будуць выплачывацца ў працягу 10 гадоў у роўных ратах на 5 прац. гадавых, за падставу ацэнкі маюць служыць абшарніцкія дэкляарацыі прадстаўленыя абшарнікамі

Аграмічэньні эміграцыі да Уругвая.

Эміграцыйны ўрад атрымаў ад польскага пасольства ў Буэнос-Айрэс паведамленьне, што дзякуючы вялізарнаму наплыву эмігрантаў да Уругвая цяжка знайсьці там працу і польскія эмігранты знаходзяцца дзеля гэтага ў вельмі цяжкіх варунках.

Каб устрымаць асоб, якія маюць замер эміграваць да Уругвая, на падставе фальшывых аб гэтым краі інфармацыяў ад цёмных вынікаў выезду эміграцыйны ўрад ізноў паведамляе, што затрымаў выдачу эміграцыйных (бясплатных) пашпартоў да Уругвая для ўсіх катэгорыяў эмігрантаў, за вынятакам: 1) асобаў, якія дакажуць што маюць патрэбную гатоўку (сямья—300 амэрыканскіх даляраў, паадзінокія асобы—150 дал. пасьля аплаты коштаў дарогі, якая выносіць 100 дал. ад асобы); 2) асобы, выезджаючыя да сваіх семьяў. Гэтая апошняя катэгорыя эмігрантаў павінна прадставіць запросіны (affidawity) ад працадаўцаў ці сваякоў, роўна арыгінальныя пісьмы ад блізкіх сваякоў, выклікаючых даную асобу да сябе і гарантуючых іх утрыманьне.

Перасьцерагаюцца гэткім чынам рамесьнікі і работнікі землябробскія і фабрычныя, роўна і інтэлігэнцыя, каб не распачыналі крокаў на выезд да Уругвая, калі толькі ня маюць выжэй вызначанай гатоўкі ці дакумэнтаў.

Важна для эмігрантаў з Польшчы

Польскія сэзановыя работнікі ў Нямеччыне забавязаны пастаянна плаціць падатак на бюро па аказаньню грашовай дапамогі для безработных, з якога аднак ніякай помачы безработныя эмігранты не атрымліваюць

Цяпер нямецкі міністар працы выдаў дапаўвіцельнае распараджэньне па якому сэзановыя работнікі з Польшчы звальняюцца ад уплаты грошаў на карысьць бюро, калі гэтыя работнікі прыбылі на аснове дагавора ад сьнежня 1926 г.

Што ж датычыцца работнікаў, маючых г. зв- „Befraungschein“ і не належачых штогодняму выдаленьню з Нямеччыны, дык гэткія работнікі плацяць падатак на карысьць бюро.

Біржа.

Даляры	8, 90—8, 94 зл.
Залаты рубель	4, 65 зл.
Сярэбраны рубель	2, 76 зл.
Чырвонец	33, 75 зл.

Збожжа

(*Варшава*)

Жыта (100 кілагр.-6 пудоў)	— 43, — зл.
Пшаніца „ „	57 58 зл.
Ячмень брав	— 40 зл.
Ячмень крупяны	— 36 зл.
Авёс „ „	39 — 40 зл.

(*Віленшчына*)

Жыта (100 кілагр.)	42,50 43,50 зл.
Пшаніца „ „	57 — —58, — зл.
Ячмень бравароwы	41 — 45 — — зл.
Ячмень крупяны	36 — 40 — — зл.
Авёс „ „	38 — — 42,50 зл.

Тутэйшая хроніка.

Канец „Narodnaha Zwonu“. На астатнім паседжаньні гаспадарчым Акружны Суд згодна з прапазыцыяй пракурора пастанавіў зачыніць „Narodny Zwon“, орган Грамады, аж да часу выданьня ў гэтай справе прыгавору.

Прызыў навабранцаў. 4 траўня вызначаны прызыў у армію асобаў, якія радзіліся ў 1906 годзе, а таксама ў 1898 і 1905 г.,якія павіннасьці не адбылі. Адначасна пачнецца прыймо ахвотнікаў, якія радзіліся ў 1907, 1908 і ў 1909 годзе.

Магчымасьць роспуску Мястовае Рады. Па роспуску Мястовае Рады ў Варшаве мае прыйсьці чарга на Мястовую Раду ў Вільні. Рашэньне гэтае прынята ў сувязі з вынікамі рэвізіі, якую зрабіў начальнік Самаўрадовага Аддзелу п. Стрэлецкі.

Рэвізія выказала, што віленская Мястовая Рада не стаіць на вышыні заданьня.

Новая рэвэляцыя „безгаловых“ сельсаюзьнікаў. Газэты падалі вестку, што некалькі *сацыялістычных* соймавых групаў меншасьцяў, адбылі супольную канфэрэнцыю. На гэтай канфэрэнцыі ад імя сацыялістычнага (!?) Сельсаюза выступаў Ярэміч.. Клясовая сялянская арганізацыя... прызнаваньне зямлі на ўласнасьць... і сацыялізм!

Гэтакую капусту з гарохам можа дапусьціць толькі высока адукаваная і разумная галава п. Ярэміча!

Наіўнасьць ці нахальства? Беларускі Каапэратыўны Банк у Вільні, які быў зусім выразнай і адкрытай эканамічнай плацоўкай Грамады, выслаў запярэчаньне ў газэту „За Свабоду“ аб тым, што ён не ліквідаваўся і што ён нічога супольнага ні з Грамадой, ні Н.П.Х. ня мае...

Дзівімся антыбальшавіцкай „За Свабоду“, якая так лёгка дае сябе абаламуціць грамадаўскім экспазытурам і дае гасьцінна мейсца для запярэчаньня ўсім у Вільні ведамага факту, што Банк быў і ёсьць выразнай эспазытурай нябошчыцы Грамады.

На чырвонае яйко. Б. Друцкі-Падбэрэскі ахвяраваў на Горадзенскі Беларускі Прытулак, дзецям на чырвонае яйко 40 злотых.

Жыцьце провінцыі.

Нішчаць беларускія газэты.

(*Слонімскі павет.*)

Камандант пастарунку ў Гавэновічах Шылавіцкае гм. надта ня любіць беларускіх газэт. Калі ўбачыць у каго газэту, дык ланкам і пагрозам німа канца. І вылае і да „пакі“ завясьці суліць... Ня ўступае яму ў гэтым солтыс А. Тарасюк, які асабіста зьнішчае беларускія газэты, якія забірае ў гміне і ніколі не аддае адрэсатам. Калі-ж нехта пачне дабівацца сваей газэты, дык пагражае данесьці ў паліцыю.

Час было-б спыніць гэтыя непарадкі.

Горні.

З Горадзеншчыны.

Камандант паліцэйскага пастарунку ў вёсцы Капцёўка пав. Горадзенскага Асташэўскі вельмі любіць займацца рукапрыкладзтвам; безжаднай прычыны пабіў жыхара вёскі Кірэнявічы Максіма Зайко, за што быў пацягнуты да судовай адпаведнасьці з арт. 475 к.к. і Акружным Судом у Горадні (wydział odwoławczy) гэты камандант засуджаны на 3 дні арышту альбо 25 зл. штрафу. Але ня гледзячы на гэта камандант Асташэўскі сваей спрытнасьці да рукапрыкладзтва ня спыняе. Відаць за мала яму кары.

Сьцяпан.

Слонімская хроніка.

Языковая Устава ад 31. VII. 24 г. дае права на родную школу. Беларуская школа даўно-б істнавала, каб не крыўдзячае распараджэньне выканоўчае міністра асьветы ад ад 7. I. 25 г.

Мы, Беларусы Слонімшчыны, ня можам сьцярпець таго факта, што ў Слонімшчыне ёсьць толькі адна беларуская школа (ў в. Рудаўка, Міжэвіцкай гм.) падчас, калі жыдоўскіх школаў поўна... (м. Слонім, Бытэнь, Дзярэчын). Апрача таго ў Слоніме ёсьць жыдоўская гімназія!

Жыды маюць больш правоў за нас. Чаму? Адказ просты: арганізацыя. Дык сяляне зараз-жа еднайцеся каля сваей Беларускае Нац. Рады і Т-ва „Прасьвета“.

Работнікі лесапілак жыдоўскіх у Бляк-Бытэні, Лясной, Даманове, Рахвалоўцы і інш. працуюць па 10 гадзін у дзень, замест 8. Гдзе тутака ёсьць „ochrona pracy“ і інспэктар?

Німа ніякай помачы для бедных работнікаў. Працуй 2 гадзіны лішнія на жыдоў..

Баліць нас тое, што на становішча войтаў прысылаюць людзей па.. „nominacji“.

25. III. 27 г. у в. Чамяры, Слонімск. пав. была вывешана чырвоная комуністычная шмата

Пасьля ліквідацыі „Грамады“, яе правадыры пачалі зноў блутацца начамі па спакойных вёсках і хутарох! Чаго? Ад часу заглядаюць у вокна „праклятых нацыяналістаў“ і сачаць за прыхільнікамі Белар. Нац. Рады.

У часы паважнага крызіса „чырвонай арміі агітатараў“ быў даны маральны адпор з боку „нацыяналістаў“, — гэтага ня могуць сьцярпець таварышы і шукаюць зачэпкі!

Чырвоныя хуліганы павінны ведаць раз на заўсёды, што „сэкрэтных прыгавораў сьмерці“ ніхто цяпер не пужаецца. Прайшла тая пара!

У адказ на вашыя пагрозы — мы, сябры і прыхільнікі Белар. Нац. Рады—энэргічна паведзем сваю працу сярод сялянства.

Кожнаму платнаму, чырвонаму шпіку, сярод нас ня будзе мейсца!.

Ад станцыі Езёрніцы да Слоніма білет паводле афіцыяльна вывешанай таксы павінен каштаваць толькі 1 зл. 42 грош. Каса ў Езёрніцы бярэ 1 зл. 50 гр. Цікава ведаць, у чыю кішаню ідзе „nadwyżka“ 8 грош. з кожнага білета?!.

26. III 27 суд у Слоніме разглядаў справу сьвяшч. з в. Мізгіры, Слонімскага пав., які без дазволу П.К.У. для жаніха павянчаў маладых Сьвяшч. аштрафаваны на 250 зал.

У той-жа дзень разглядалася справа камэнданта паліцыі ў Бытэні — нейкага Садоўскага, абвінавачанага паводле 475 ст. К.К. Справа вось якая:

У м. студзені ў Бытэні кабета прадала жыдоўцы на вуліцы 10 яёк па 14 гр. штука. У гэты мамэнт падыйшоў Садоўскі і спытаўся, ці яйкі ўжо прадала кабета. Пачуўшы што так, Садоўскі „polecił“ зьвярнуць грошы жыдоўцы і каб кабета з ім пайшла. Прыйшоўшы да кватэры камэнданта, той забраў яйкі і заплаціў толькі па 10 грош за штуку. Кабета з пачатку прасіла каб яе не крыўдзіў, а пасьля пачала плакаць. Як паказалі на судзе сьведкі, Садоўскі праганяў кабету, а пасьля ўзяўшы за валасы пацягнуў да пастарунка, б'ючы па дарозі. - За гэтую „яешню“ Садоўскі дастаў месяц арышта і 20 зал. судовае аплаты. Уласьнік маёнтку Ст.-Дзявяткавічы, Сьлізень, трэбуе за дзесяціну ліхой зямлі 800 залат. Хто з сялян можа купіць за такую цану і адкуль ўзяць столькі грошаў?

Земская ўлада павінна зьвярнуць увагу на гэтае зьявішча і пацягнуць Сьлізьня да адказнасьці

Грамадаўскі шпік-брахун Янка Трафімовіч са Смаўжоў, Слонімск. пав., пасьля ліквідацыі „Баецка Савецка-Рэвалюц. Грамады“, мае цяпер замер адкрыць склад хварбаванага на чырвонае палатна, якое ёсьць у модзе...

Бяда толькі, што жонка ня хоча хварбаваць. Мае розум кабета!

21. III. 27 г. каля в. Вял.-Езёркі, Дзярэчынскай гм., быў забіты чалавек з та-ж вёскі. Як хутка выясьніла сьледзтва, забойца ёсьць нейкі Галіцкі, сябра-бандыта „гуртка“ ў В.-Езёрках. Мэта забойства—грабёж. Галіцкі прызнаўся, што ўбіў свайго суседа. — Цяпер сядзяць у вастрозе ў Слоніме.

Вось якія „ідэйныя“ людзі — зьверы напаўнялі шэрэнгі „Грамады“. А мо' чырвоная аднаднёўка Луцкевіча запярэчыць гэты факт?

Просім, калі можна...

Усячына.

Калі магамэтанін можа мець некалькі жонак.

Егіпецкі ўрад запрапанаваў парляманту праэкт новага закону аб жэнючыхся для мусульман. Праэкт прадбачыць, што мусульманін можа жаніцца на некалькіх жанчынак толькі тады, калі дакажэ, што мае адпаведную маемасьць або даходы.

Бальшавікі падтрымліваюць штунду.

Людзі, што паварочаліся з Савецкае Украіны да Падэбрад (Чэхаславакія), кажуць, што бальшавікі падтрымліваюць штунду (сэктанты накшталт баптыстаў і мэтадыстаў) як толькі могуць. Звальняюць ад вайсковае службы і памагаюць штундзістам рожнымі іншым спосабамі. Гдзе ў вёсцы ёсьць некалькі штундзістаў, дык ўсі на іх глядзяць як на агэнтаў Г.П.У.

Піша аб гэтым украінскі „Новы Час“ у Львове.

Ад сябе-ж дададзем, што бальшавікі і розныя сэктанты падтрымліваюць сябе ўзаемна ня толькі ў С.С.Р.Р

Тое што робіцца пад нашым бокам, як лепей ня можа быць, гавора аб гэтым. Гэта-ж увесь цэнтральны камітэт Грамады знаходзіўся пад моцным уплывам мэтадыстаўскага пастара В. А сам галоўны сэкрэтар Грамады зьяўляецца духоўнай мэтадыстаўскай асобай, два разы на месяц гаварыў свае пропаведзі ў мэтадыстаўскай маленьні ў Вільні на Троцкай вуліцы.

Паштовая скрынка.

І Чайкоўскі. — газэту для палітычнага вязьня Жэбелева высылаем.

Левіцкі Вацлаў — калі ў Вас ёсьць што да друку — дык прышліце.

К Маеўскі — у адміністрацыі спраўджана, што па усіх адрасох Вамі прысланых — газэта высылаецца акуратна. Прычынай неатрымліваньня адрэсатамі газэт зьяўляецца або пошта, або гміна. Навядзеце спраўкі і паведаміце рэдакцыю

Ш. — Т. патрэбны N „Белар. Слова“ і пісьмо Вам высылаецца.

З. Кульгавы — усіх нумароў „Белар. Слова“ за прошлы час выслаць ня можам, бо разыйшліся. Карэспандэнцыю не зьмешчаем, бо аб гэтай справе ўжо пісала адна віленская газэта. Адказ на запытаньні будзе высланы па пошце.

Л. Шостак—высылкі газэты Вам не спынім.

Богдан Станіслаў — нашая газэта друкуецца толькі гражданкай.

Рулінскі Максім—па прысланым адрасам газэту вышлем. Высылаем Вам пісьмо.

Тамаш Сьмех (Г-ш Л-ык)—калі-ж нарэшце дасьцё нам спакой і кінеце пісаць свае аткрыткі. У тым, што Вы добра ўмееце лаяцца, мы ўжо даўно пераканаліся. Больш Вашых пісьмаў чытаць ня будзем і яны пойдуць проста да кошу.

Гінко Язэп, Дударэвіч Янка, Сільвановіч Зьміцер, Панькоў Мікола, Тараімец Алесь, Сільвановіч Лявон Мулар Фільман, Астапчык Рыгор, Амельянаў Кастусь, Чура Кастусь, Сільвановіч Сапрон, Гарэшка Кастусь, Дударэвіч Мікола, Аляксеевіч Мікола, Адакевіч Міхал, Галоўчыц Клім, Сільвановіч Саўка, Бліні Станіслаў, Няпloха Янка, Ляпёшка Мікола, Влашчаніца Барыс—*газэту высылаем.*

Саўчыка Мікола, Цэгалка Павал, Семак Янка Бурсэвіч Пётра, Лазавік Мікола, Карповіч Базыль, Зізюк Міхал, Ііліч Сымон, Ромыш Язэп, Клемантовіч Антон, Палянскі Мікола, Іліч Ануфры, Бурсэвіч Янка Адамовіч Аляксандар, Палтарака Рыгор, Кур'яновіч Кастусь, Кур'яновіч Янка, Машонскі Пётра, Петрашка Янка, Аксючык Янка, Ярашэвіч Кастусь, Ярашэві Аляксандар, Фадзюкевіч Броніслаў, Саўка Янка, Пабудзей Антон, Паўлюкоўскі Антон, Сакалоўскі Аляксандар, Гардлеўскі Антось, Гурын Сапрон, Барысэвіч Ларэн Кобак Пётра, Пашкоўскі Аляксандар Мусін Уладзімер, Аленціновіч, Муліца Адольф, Прака Сьцяпан, Мазы Кастусь Багушэвіч Янка, Ілюкевіч Андрэй, Клус Янка, Паўлюкоўскі Янка, Бычко Станіслаў, Карачун Аляксей, Крыцкі Нікіфар, Алешкевіч Мікола, Астапкевіч Уладзімер, Астанкевіч Ігнат, Буйвал І., Куніцкі Павал, Габец Мікола, Баліцкі Мікола, Габец Павал, Баліцкі Алексей —*пробныя нумары „Беларускага Слова“ высылаем.*

Ядвігін Ш.

РАБЫ.

Нават і радзіўся не зусім так, як найбольш родяцца, прымерам у якім-колечы брудным кутку, дый цэлай кучай; не—радзіўся, як прыналежыць іхняму роду, у вялізарных, аздобных мурах, на чыстай, як пярына мягкой саломе і то адзін-адным.

Вялізарная, таўстая, сытая, паважная матка яшчэ і не адсаплася добра, калі ўжо першы піск дзіцяці стрывожыў увесь сьвінарнік.

Па ўсіх загародках, каторыя пароблены былі абапал доўгага калідору і дзе жылі то далейшая, то бліжэйшая радня, або хоць і зусім чужыя, але так сама з важнейшага роду,—пайшоў вялікі непакой.

Рохнуў першым, высунўшы з саломы лыч, стары рабы кнур; за ім адазваліся ў суседніх загародках кармякі; адтуль рохканьне перадавалося і шырылася далей і далей, — яшчэ момэнт—і ўзьняўся такі гармідэр, што хоць гэта была самая поўнач, ачнуўся нават вартаўнік, каторы смачна хроп на бруднай тухлай саломе ў цеснай баковачцы, прыбудованай да сьвінярніка. Падняўся Марцін, працёр кулакамі вочы, пацягнуўся і, нашчупаўшы на лежанцы сернікі, запаліў ліхтарню, адчыніў дзьверы на калідор і стаў абходзіць па чародзе ўсе загародкі, падыймаючы агонь у верх. Натрапіўшы ўрэшце на прычыну трывогі — радзіны, затрымаўся Марцін, абвёў ліхтарняй ўсю загародку, зважна прыглядаючыся дый, мармочучы нешта сабе пад нос, сплюнуў, завярнуўся і пайшоў будзіць аканома.

Не рад, відаць, быў пан аконам а гэтакай пары вылазіць з цёплай пасьцелі: доўгі час круціў ён сваімі нашупырэнымі, як у таракана, жоўтымі вусамі, але-ж што зробіш: на тое служба!—устаў, апрануўся і пацягнуўся будзіць ахмістрыню.

Падыйшоўшы пад вакно, стаў сьпярша дэлікатна барабаніць па ім костачкай зложанага ў кручок пальца, пасьля ляпаць усей пецярней, урэшце, як пачаў пражыць кулаком у ваконную раму,—дык праз нейкія поўгадзінкі выпаўзла такі з пярыны тоўстая, прысадзістая ахмістрыня і, даведаўшыся, ў чым справа, валюхаючыся, як качка, пайшла ў пекарню, дзе сваімі пухлымі, чырвонымі кулакамі, як бач, падняла на ногі дзьвёх дзевак—спадручніц сваіх, і гэтак грамадой сунуліся на мейсца важнага здарэньня.

Віднецъ ужо пачынала, калі яшчэ агонь мігочучы, пералятаў то з сьвінарніка ў пекарню, то з пекарні ў сьвінарнік; і толькі днём, калі камісар па дакладу аканома і ахмістрыні ўпісаў у кнігу, што гэткага та чысла, месяца і года ад такіх-та бацькоў радзіўся рабы парсюк, ды занумараваў яго, — ўсе супакоіліся. Толькі дзеўкам праз нейкі яшчэ час трэба было насіць маладой матцы асобую, лепшую яду, ахмістрыні — выдаваць на гэты корм іншую прымешку, а Марціну—часьцей зьменяць падсьцілку. Але ў скорасьці ўсё наладзілася, і жыцьцё паплыло сваім звычаем.

Гадаваўся Рабы на ўзьдзіў: і ў рост яго гнала і сыць брала непамерна; але бо, праўду кажучы, і яды яму было не набрацца: сваю мерку спытлюе, дый пачынае свірчэць,—усё яму падбаўляй, ды падбаўляй, а чаго ўжо сам не ўбярэ, дык хоць выверне з пасудзіны, абы другі не пажывіўся. Калі-ж, бывала, выпушчалі сьвінскую моладзь на волю— крыху пабрыкаць, ніводзін так, як Рабы, не дурэў: ніводзін, як Рабы, ня вышукае так скора слабейшага мейсца ў паркане і, хоць сам тоўстават, а такі праз невялічкую шчыліну і то выцісьнецца з выгана, ды першы ўб'ецца ў шкоду; але, калі прыйдзе які страх, першы і драпане адтуль,—дык ані калок, ані пуга ні разу не дакрануліся да яго дэлікатнага цела! Забяруцца, бывала, сьвіньні ў сажалку пакупацца, — ўсе павылазяць адтуль мурзатыя, укачаўшыся ў балота, а наш Рабы,—хоць разам валяўся,—выйдзе, страханецца, дзе паскрабецца і зноў чысты, гладкі, быццам і ня быў там.

Час у выгодзе скора ляціць. Мінуў год, зьляцеў другі, і не агледзіўся наш Рабы, як разбухаўся ўжо так, што і з хлева вылазіць ня хоча; сядзіць на адным мейсцы і дзень і ноч, сапе, храпе, лыпае заплыўшымі салам маленькемі сваімі вочкамі, дый цяжка ўздыхае, гледзючы на яду: зьмёў-бы, здаецца, усё, а як прыйдзецца — лізьне раз, другі і хоць ты што—ня лезе.

Гневаўся цяпер Рабы на падрастаючую моладзь падсьвінкаў: лётаюць, пішчаць, крычаць, дурэюць — ліха ведае чаго! От, сядзелі-б, як сядзіць ён—спакойна важна — і не перашкаджалі-б іншым драмаць. Злаваў Рабы і на непарадкі, якія час ад часу бывалі ў сьвінарніку: находзяць нейкія людзі — і то хоць-бы свае, а то чужыя, цягаюцца па загародкам, хватыгуюць такіх, як ён — Рабы, важных сьвіней; падыймаецца, разумеецца, на ўсю будыніну такі страшэнны гармідэр, што ажно жутка слухаць Але ў скорасьці ўсё супакоівалася, — супакоіваўся і Рабы і толькі дзівіўся, на што і каму патрэбны гэтыя зьдзекі.

Ажно прыйшлі ўрэшцё гэтыя самыя людзі і да яго—Рабога; прыйшлі заранья—яшчэ прыцемна—з ліхтарняй, сьвятло каторай так і рэзала заспаныя вочы парсюка.

Стаў рохкаць нездаволены Рабы і ўжо думаў падняцца з гнезда, каб-ткі добра напудзіць няпрошаных гасьцей, калі пачуў, як нейкі вялізарны цяжар прываліў яго, а заднія абедзьве нагі бытцам ушчаміліся... Гэткай зьневагі ня мог сьцярпець Рабы і толькі што хацеў разінуцца, ды крыкнуць так, каб ажно ўсе браты пачулі яго крыўду, як тут-жа нейкая пятля моцна сьцягнула і заціснула яму лыч. Цяпер ён мог толькі ўжо сквірчэць; а тым часам цяжары валіліся на яго з ўсіх старон прыдушывалі яго, выкручывалі яму ногі, цягнулі за вушы...і раптам пачуў Рабы як нешта халоднае, сьлізкае ўпіваецца яму ў грудзі... Задрыжэў Рабы са страху, а пасьля і ад страшнага болю, бо тое, што сьперша выдалося яму халодным, цяпер пякло ў грудзёх жывым агнём, ды разам бухнуў гэты агонь у галаву і разьляцеўся па ўсім целі...

Што прыйдзецца раставацца калі колечы з жыцьцём нават і сьвінскаму роду, аб гэтым Рабы чуў і ведаў, але аб сьмерці ніколі ня думаў. „На гэта будзе часу!“—пацешаў сябе Рабы,—„калі сьмерць стане падхадзіць“. І вось цяпер зразумеў ён, што гэта сьмерць і ня думала надыходзіць, а наляцела, — наляцела так неўспадзеўкі, як толькі мела налятаць яна. І не аб гэтай сьмерці думаў ўжо Рабы, бо ведаў добра, што яе усё роўна ня міне: праз агнём пражаны мозг віхрам пралетала ўсё мінулае яго жыцьцё. Стараўся цяпер Рабы ўспомніць, што зрабіў ён праз час гэтакага жыцьця добрага і благога? Ці-ж ён каму зрабіў што благое?. Не — гэтага ня мог Рабы аб сабе сказаць. А добрага? Добрага — што-ж?? сьпешаўся, слабеючы ўжо, успомніць бедак. Ага: праз усё сваё жыцьцё нікому нічога не зрабіў, ну і. смачна еў, смачна піў, смачна спаў. Ці-ж мала яшчэ гэтага? І, з успакоіўшымся ўжо сумленьнем, апошні раз захроп Рабенькі і... даўся.

Са зборніку „Бярозка“

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Выдавец. Т-ва АЛЬФА, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.